# Напярэдадні прафесійнага свята медыцынскія работнікі Астравеччыны прымалі віншаванні

18:00 / 17.06.2022

**У Астравецкай дзіцячай школе мастацтваў прайшла святочная цырымонія ўшанавання лепшых работнікаў здароўя нашага раёна.**

– Паважаныя калегі, дарагія сябры! Нарэшце, настаў той момант, калі мы змаглі з вамі сабрацца разам, зняць м павіншаваць адзін аднаго з надыходзячым святам – Днём медыцынскіх работнікаў, – адзначыў галоўны ўрач Астравецкай цэнтральнай раённай клінічнай бальніцы Уладзімір Мажэйка. – Быў складаны і няпросты перыяд каронавіруснай інфекцыі – але мы годна прайшлі гэты шлях разам. Самае галоўнае – змянілася наша мысленне навучыліся працаваць больш аператыўна, згуртаваўся калектыў. Часам нават з небяспекай для ўласнага здаро аказвалі дапамогу хворым на “ковід”. Дзякуй за намаганні, якія вы ўкладалі ў лячэнне пацыентаў. Пасля пандэм пачынаем працаваць планава і выходзім на максімальна закладзены патэнцыял нашай установы. Шчырыя віншаванні адрасую ветэранам медыцыны, якія не шкадуючы часу дзяліліся з намі сваімі ўменнямі і вопытам. Д гадоў жыцця!

У гэты дзень Астравеччыну наведаў намеснік прэм’ер-міністра Ігар Петрышэнка, які пакінуў віншаванне для астравецкіх медыкаў – яго прачытаў Уладзімір Мажэйка.




Ад імя раённай ўлады да віншаванняў далучылася старшыня раённага Савета дэпутатаў Ірына Тальчук.

– Ад нараджэння да самага апошняга ўздыху вы суправаджаеце чалавека. Праца медыцынскіх работнікаў – адк высакародная, – падкрэсліла Ірына Тальчук і зачытала прывітальны адрас. – Урач вучыцца ўсё жыццё і кожны працоўны дзень – гэта новая няпростая задача. Несумненна самае высокатэхналагічнае і сучаснае медыцынск абсталяванне не прынясуць карысці без удзелу людзей ў белых халатах. Дзякуй за адданасць справе, добрасумленную работу – і нізкі паклон за бяссоныя ночы і ўратаваныя жыцці.


ostrovets.by


ostrovets.by







Шчырыя словы і падарункі медыцынскім работнікам Астравеччыны адрасавалі старшыня прафсаюзнай пярві
арганізацыі Астравецкай ЦРКБ Вікторыя Страцэўская і лідары раённых арганізацый “Беларускі саюз жанчын” і
Русь” Наталля Баніцэвіч і Ірына Раткевіч.







Акрамя гэтага, праца многіх работнікаў аховы здароўя Астравеччыны была адзначана ўзнагародамі рознага ўз
На сцэну падымалася загадчык інфекцыйнага адзялення Юлія Кавалька, якая сёлета стала лаўрэатам прэміі
“Прызванне” ў намінацыі “ўрач”. На жаль, па аб’ектыўных прычынах у зале не было загадчыка дыягнастычнага
аддзялення Дзмітрыя Кардзіса, які ўзнагароджаны знакам “Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь”. Ганар
граматы і падзякі галоўнага ўпраўлення аховы здароўя Гродзенскага аблвыканкама атрымалі зубны фельчар К
Клімашэўская, тэрапеўт Дзіна Мажэйка, педыятр Вікторыя Страцэўская і медыцынскія сёстры Галіна Ляховіч і Л

Дасюкевіч. Астравецкі раённыя выканаўчы камітэт і Савет дэпутатаў адзначылі загадчыка Кямелішкаўскай амбулаторыі ўрача агульнай практыкі Валянціну Пятроўскую, сястру-гаспадыню Наталлю Барцэвіч, рэнтгеналабаранта Людмілу Герман, загадчыка Міхалішкаўскай бальніцы сястрынскага догляду Генрыха Калта вадзіцеля хуткай дапамогі Генадзя Масейку, тэрапеўта Дануту Субаткевіч, медсясцёр Інэсу Іванову, Валянціну Пяткевіч, Чаславу Шчолка, Марыну Багдановіч, Аліну Алёхна, Галіну Нарэйка, Таццяну Герасім, загадчыка стаматалагічнага аддзялення Ірыну Смаль, афтальмолага Ганну Філістовіч, санітарку Дануту Козел.









Ганаровыя граматы Астравецкай ЦРКБ атрымалі загадчык жаночай кансультацыі Алеся Грыб, намеснік галоўна
ўрача Андрэй Дэрвіс, фельчар-лабарант Ганна Палачанская, акушэрка Людміла Ромаш і рэнтгена-эндаваскуляр
хірург Барыс Невідовіч.

Пасведчанні да нагруднага знака залатой і сярэбранай вартасці “Фізкультурнік Беларусі” Міністэрства спорта і
турызма былі ўручаны эканамісту Ірыне Сінькевіч, урачу ЛФК Жанне Волк-Леановіч і ўрачу агульнай практыкі Е
Лось.

Віншаванні, кветкі, узнагароды і музычныя падарункі ў выкананні педагогаў дзіцячай школы мастацтваў – усё б
для медыцынскіх работнікаў.


ostrovets.by


ostrovets.by






Текст:

Фото: **Алёна Ганулич**

Поделиться:

## Похожие новости



Производство сельхозпродукции в Беларуси в январе-марте увеличилось на 6,8%




Медиасфера-2024: мастерство и творчество молодого поколения




"Белтелеком" повышает некоторые тарифы на услуги



ЦИК принято решение о соз 24-25 апреля

АСТРАВЕЦКАЯ ПРАЎДА



© Все права принадлежат редакции газеты «Астравецкая праўда».

При использовании публикаций сайта и материалов групп в социальных сетях ссылка на источник и автора обязательна.

Перепечатка материалов – только с письменного разрешения редакции. Любые изменения текстов, заголовков, фотографий при перепечатке ЗАПРЕЩЕНЫ. Активная и индексируемая гиперссылка на источник обязательна.